**Кажамякін**, Л. Начны палёт / Л. Кажамякін // Прамень камунізму (Гарадок). — 1988. — 23 лют. — С. 3.

## НАЧНЫ ПАЛЁТ



... Магутны ТУ-134 вырульваў на старт. У канцы ўзлётнай паласы спыніўся. Заціснуты на «мёртвую» тармазамі, самалёт нібы прысеў перад узлётам у неба. Маторы набралі максімальныя абароты. Здавалася, яшчэ нямнога, і яны не вытрымаюць, разляцяцца на дробныя часткі. Але не, тармазы адпушчаны, і машына спачатку марудна, а затым усё хутчэй і хутчэй памчалася па ўзлётнай дарожцы. Сяргей глянуў у акно. Зямля была ўжо ў нейкіх 60-80 метрах. Самалёт рэзка набіраў вышыню і, зрабіўшы невялікі паварот, накіраваўся строга на поўдзень. Яго пасажыры – салдаты і афіцэры – расслабіліся. Курс машыны быў вызначаны яшчэ раней – Дэмакратычная Рэспубліка Афганістан, горад Кабул.

Вось і стаў ты, Сяргей, сапраўдным салдатам, – думаў стройны, хударлявы юнак, гледзячы праз шкло ілюмінатара на далёкую зямлю. Розныя думкі ішлі ў галаву. Адна з іх непакоіла больш за усіх: як там, у Афганістане, што чакае?

Гэта невядомасць, новая абстаноўка і новыя людзі выклікалі ў Сяргея ўспаміны. Перад вачыма праплывалі эпізоды жыцця – дзяцінства, школа, вучоба ў Лужаснянскім саўгасе-тэхнікуме. Нейкія імгненні яго жыцця здаваліся яму зусім нязначнымі, а іншыя – наадварот, вырасталі, прымушалі задумацца.

Нарадзіўся Сяргей Брадзягін у г. Амурску Хабараўскага краю. Так што Далёкі Усход, можна сказаць, яго радзіма. Там пайшоў у школу, вучыўся да трэцяга класа. Але здарылася так, што прыйшлося пераехаць у Беларусь, бліжэй да родзічаў. А ў шосты клас Сяргей хадзіў ужо ў Езярышчанскую СШ (да гэтага два гады вучыўся ў вёсцы Лосвіда, бо там жыла бабуля). Закончыўшы школу, Сяргей у думках не ўяўляў сабе папулярныя ў моладзі прафесіі – артыста, журналіста або якога-небудзь іншага работніка, вядомага ўсёй краіне. Не, ён, зведаўшы з маленства цану кавалка хлеба, вырашыў адразу – набыць трэба спецыяльнасць, якая спатрэбіцца на ўсё жыццё. Можа менавіта і гэта стала галоўным пры выбары многіх варыянтаў. У рэшце рэшт паступіў у Лужаснянскі саўгас-тэхнікум па спецыяльнасці «агранамія». І вось аднойчы паштальён прынёс павестку: «Пры сабе мець дакументы, лыжку, трохдзённы запас харчоў»...

15 кастрычніка 1986 года Сяргей Брадзягін у складзе адной з каманд, якія фарміраваліся тады у Віцебскім аблваенкамаце, быў накіраваны ў вучэбнае падраздзяленне: папаў у паветрана-дэсантныя войскі. Сказаць, што папаў туды выпадкова, нельга. І вось чаму. Яшчэ ў час вучобы ў Лужаснянскім саўгасе-тэхнікуме загарэўся марай навучыцца скакаць з парашутам. І ажыццявіў яе. У Віцебску пры абласным камітэце ДТСААФ ёсць гурток, які рыхтуе парашутыстаў. Запісаўся туды.

... І зноў перад вачыма Сяргея праплываюць карціны яго вучобы ў школе ДТСААФ. Вось інструктар дае ім тэарэтычныя веды, расказвае аб тым, як весці сябе ў паветры. Вось другі інструктар паказвае, як правільна ўкласці парашут, замацаваць яго на сабе, што рабіць у выніку аварыйнай сітуацыі. Запомніў тады словы старэйшых таварышаў:

— Ніколі не трэба панікаваць!

Маторы магутнага ТУ-134 роўна спявалі сваю песню. За ілюмінатарам згушчалася цемра – наступала ноч. Сяргей ведаў – душманы, калі ляцець днём, такую цэль ніяк не прапусцяць. Да таго ж, зенітна-ракетныя комплексы, якія пастаўляюцца з заходніх краін, мае амаль кожная банда. Вялізны самалёт з выключанымі бартавымі агнямі лёгка пранізваў цемру, імчаў усё далей і далей. І зноў Сяргеем авалодалі ўспаміны.

Першы скачок з парашутам... Было, як у сне. Памятае толькі каманду інструктара: “Пайшоў!". Цяжэй было другі раз, калі зведаў ужо цану скачка. Жах адолеў ім, але паказаць яго перад таварышамі пасаромеўся. Прагучала каманда “Пайшоў!”. Нават і ценю сумнення не было на твары. Толькі на мінуту затрымаўся на краі люка і рэзка адштурхнуўся. Трэці скачок нават і не запомніў. Увогуле ж, курсантам для заліку патрабуецца зрабіць тры скачкі. У Сяргея – чатыры... Адкуль яны? Лёгкая ўсмешка кранула вусны юнака. Юра Белы, яго сябра, пасля першага скачка прыйшоў і папрасіў:

— Сяргей, скокні за мяне!

Сяргей скокнуў. Так з'явіўся ў кніжцы запіс аб чацвёртым скачку.

Роў матораў самалёта змяніўся. Бачна, самалёт пайшоў на зніжэнне. У салоне загарэліся надпісы: “Прышпіліць рамяні! Не курыць!”.

Салдаты пачалі рыхтавацца да пасадкі. І вось начны Кабул. Самалёт, зрабіўшы проціракетны манеўр, зайшоў на пасадку. На кароткі час успыхнула markdownрознакаляровымі агнямі пасадачная паласа, загарэліся пражэктары самалёта. Байцы адзін за адным пакідалі салон, а камандзіры ўжо збіралі сваіх салдат на размеркавальны пункт. Назаўтра ўсе, хто прыляцеў, слухалі загад камандавання.

Джэлалабад – горад і цэнтр аднайменнай правінцыі, размешчаны ва ўсходняй палавіне краіны, бліжэй да Пакістана. Менавіта тут, па гэтай правінцыі, ажыццяўляліся вылазкі бандыцкіх фарміраванняў – душманаў. Тут пралягалі шляхі шматлікіх караванаў са зброяй. Яны накіроўваліся з пакістанскай тэрыторыі ў глыб краіны. Сяргей Брадзягін упершыню адчуў подых вайны. У першую ж ноч, пасля прылёту сюды, на ваенна-транспартным самалёце, не вельмі спалася. А пасля таго, як разгарэлася страляніна, сон увогуле як рукой зняло. Бывалыя салдаты нават і не павярнуліся. На другі дзень афіцэр штаба зачытаў загад:

— Сяргей Брадзягін прызначаецца пісарам штаба!

Загад ёсць загад. Яго трэба выконваць. У штабе адсядзеў роўна два дні. Паперкі за гэты час настолькі надакучылі, што глядзець на іх не мог. Звярнуўся да свайго непасрэднага камандзіра з просьбай: “Не магу працаваць з паперамі, вазьміце да сябе ва ўзвод”.

Прапаршчык хітравата глянуў на яго: “Кім хочаш быць?”

– Залічыце ў разведузвод!

Так на трэція суткі знаходжання ў Афганістане Сяргей Брадзягін стаў разведчыкам. Але адно – залічыць, другое ж – быць ім. Камандзір узвода, старшы лейтэнант у час праводзімых аперацый ні на мінуту не адпускау ад сябе Сяргея. Сяргей ва узводзе быў самым маладым і, значыць, самым нявопытным салдатам.

– Будзь заўсёды побач са мной, вучыся ў мяне, – настаўляў старшы лейтэнант.

Доўга гуляць у разведузводзе Сяргею не давялося. Праз два дні яго з'яўлення паступіла каманда:

– Трэба зрабіць засаду – чакаецца караван са зброяй...

Рэзкі сігнал трывогі. Адзін за адным салдаты хапаюць сваю зброю, запраўляюць за плечы РД і наперад (РД –рукзак дэсантніка). Там ёсць усё, што патрэбна байцу пры сустрэчы з ворагам: запас боепрыпасаў, гранаты, ракеты, сухі паёк. Баявыя машыны пяхоты даставілі два дзесяткі чалавек ва ўмоўнае месца. Машыны замаскіраваны, людзі ж пайшлі далей. І вось месца, дзе трэба прабыць усю ноч. Старшым групы забаронены гучныя размовы, курэнне, нельга паліць касцёр. Цемра згусцілася, 21 чалавек пераўтварыліся бы ў аднаго. Кожны глядзеў за сваім сектарам. Праляжалі ўсю ноч – караван не прайшоў. Па рацыі атрымалі далейшы загад: чакаць! Двое сутак байцы чакалі. Вынік – як і ў першы раз. Нарэшце паступіла каманда: «Адбой!» Вярнуліся на базу. І зноў праз некаторы час трывожны сігнал падняў байцоў на ногі. На гэты раз аперацыя працягвалася 15 дзён. Заставалася два дні да яе канца. Паступіла каманда: прыкмечана банда душманаў.

Па рацыі паведамілі: “У кішлаку бандыты! Калона рассечана на двое!”

БМП заднім ходам пад'ехала да дувала. Салдаты адзін за адным пакінулі машыну, імгненна заняўшы выгадныя баявыя пазіцыі. Страляніна нарастала з кожнай секундай. Сяргей страляў у душманаў, эканомячы патроны. І ў яго бок пасыпаліся варожыя кулі ў адказ. Падумаў:

– Трэба хутчэй мяняць пазіцыю – заб'юць! Павярнуўся, кінуўся да другога вакна. Толькі два крокі зрабіў салдат, як моцны ўзрыў здрыгануў глінабітны дом. Сяргей упаў і страціў прытомнасць. Апамятаўся, калі яго ўзводны загадваў байцам Іса Каліеву і Ігару Кошалеву перавязаць нагу. Бой працягваўся, але выкліканая падмога завяршыла сваю справу: ён закончыўся ў нашу карысць. Праз колькі мінут баявы верталёт закружыўся над кішлаком. Потым – аперацыя і шпіталь.

… Часта ўспамінае тыя дні Сяргей Брадзягін. Яго аднагодкі Васіль Комлеў, Віктар Хахолка, Лёня Кірылаў яшчэ служаць у арміі. І шлюць яны пісьмы з Архангельска, Смаленска, Калугі. А Лёня Кірылаў – мотастралок – папаў у Афганістан. Сяргей, як бывалы баец, дае яму ў пісьмах парады.

Вярнуўся з Афганістана Сяргей інвалідам другой групы. Дзяржава паклапацілася аб ім. Выдзелілі бясплатна аутамабіль «Запарожац». Несумненна, будзе вырашана і пытанне з кватэрай, калі ў гэтым ўзнікне вострая неабходнасць. І хоць інваліды другой групы – не працуючыя людзі, маладому чалавеку ўсядзець дома цяжка. Сяргей спадзяецца на дапамогу раённых арганізацый у гэтым пытанні. І яшчэ адно. Была ў Сяргея Брадзягі на перад арміяй дзяўчына. Пасля таго памятнага бою перастала яна пісаць. Мае надзею ён сустрэць сваю суджаную.

І па адрасу: г. п. Езярышча, вул. Ленінская, 192, кв. 18 чакае пісем.

Нядаўна Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за асабістую храбрасць, праяўленую пры аказанні інтэрнацыянальнай дапамогі ў Афганістане, радавы Сяргей Брадзягін

узнагароджан ордэнам Чырвонай Зоркі. Ва ўрачыстай абстаноўны, у памяшканні Езярышчанскага пасялковага Савета ўзнагарода Радзімы была ўручана воіну-інтэрнацыяналісту.

Высокі, хударлявы юнак адкрыта глядзеў у вочы, калі прымацоўвалі яму ордэн. Нават слязінка паказалася. Веру, Сяргей, у жыцці будзе табе спадарожнічаць удача.

**Л. Кажамякін**.

**На здымку**: райваенком А. А. Чацверакоў уручае ордэн Чырвонай Зоркі С. Брадзягіну